ЗАЦВЯРДЖАЮ

Прарэктар
па навуковай рабоце
ўстановы адукацыі
"Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя Янкі Купалы"
_____________ П. З. Баціўн
"30" _____________ 2025 г.

# ВОДЗЫЎ АПАНІРУЮЧАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

установы адукацыі
"Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы"
на дысертацыю Зяноўка Яўгеніі Сяргееўны
***"Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі"***,
прадстаўленую на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова,
10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка

## Адпаведнасць зместу дысертацыі заяўленай спецыяльнасці і галіне навукі

Змест дысертацыі Я. С. Зяноўка "Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі", якая выканана ў ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі", адпавядае спецыяльнасцям 10.02.01 – беларуская мова і 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка, а таксама галіне "філалагічныя навукі". Прадметам даследавання з'яўляецца камп'ютарная апрацоўка суперсегментных сродкаў арганізацыі маўлення, якія перадаюць рытміка-інтанацыйную структуру сучаснай беларускай літаратурнай мовы, што адпавядае зместу навуковай галіны 8 у аспекце пытанняў культуры вуснага маўлення, прадугледжанай пашпартам спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова, зацверджаным Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь ад 13.11.2017 № 260, і падгаліне 3.10 "сістэмы спараджэння тэксту і маўлення", прадугледжанай пашпартам спецыяльнасці 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка, зацверджаным Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй Рэспублікі Беларусь ад 13.11.2017 № 260.

## Навуковы ўклад саіскальніка ў рашэнне навуковай задачы з ацэнкай яго значнасці

Актуальнасць даследавання, якое выканана Я. С. Зяноўка, не выклікае сумнення, паколькі яно накіравана на рашэнне сацыяльна значнай для Рэспублікі Беларусь задачы пашырэння выкарыстання беларускай мовы ў

тэхнічна апасродкаванай вуснай камунікацыі ва ўмовах камунікатыўна незбалансаванага дзяржаўнага білінгвізму.

У комплексным дысертацыйным даследаванні Я. С. Зяноўка вырашаны шэраг задач, звязаных са стварэннем арыгінальных камп'ютарных беларускамоўных рэсурсаў, арыентаваных на мадэляванне працэсу text-to-speech 'тэкст у маўленне', якія ў сучасных умовах высокатэхналагічнага грамадства важны не толькі для развіцця інтэрактыўнага дыялогу з рознымі тэхнічнымі прыладамі і зносін у месенджарах, але і для людзей з праблемамі зроку для пашырэння доступу да інфармацыі на беларускай мове.

**Канкрэтныя навуковыя вынікі (з адзначэннем іх навізны і практычнай значнасці), за якія саіскальніку можа быць прысуджана вучоная ступень**

У дысертацыйным даследаванні Я. С. Зяноўка атрыманы канкрэтныя навуковыя вынікі, якія адрознівае высокая ступень навізны і практычнай значнасці:

1) распрацавана аўтарская стратэгія даследавання, якая базіруецца на ўзаемадзеянні прасадычных і сінтаксічных адзінак беларускай мовы пры іх функцыянаванні ў маўленні;

2) вызначаны рытміка-інтанацыйныя асаблівасці сучаснага літаратурнага маўлення, рэлевантныя для перадачы беларускамоўнай прасодыі ў сістэмах сінтэзу маўлення;

3) створаны арыгінальны моўны рэсурс – лінгваакустычная база даных, адметнасцю якой з'яўляецца наяўнасць размечаных рытміка-інтанацыйных аўдыяфайлаў, неабходных для работы прасадычнага працэсара ў сістэме генерацыі беларускамоўнага маўлення;

4) распрацавана і эксперыментальна апрабавана методыка стварэння лінгваакустычных рэсурсаў шляхам аўтаматызацыі выдзялення рознага тыпу сінтагм з выкарыстаннем праграмнага забеспячэння NooJ.

Атрыманыя вынікі з'яўляюцца новымі, маюць высокую навуковую значнасць і могуць быць выкарыстаны ў якасці матэрыялу міждысцыплінарных даследаванняў – прасадычных асаблівасцей беларускамоўнага маўлення і для ўдасканалення сістэм сінтэзу маўлення.

## Адпаведнасць навуковай кваліфікацыі саіскальніка вучонай ступені, на якую ён прэтэндуе

Навуковая кваліфікацыя аўтара дысертацыі Я. С. Зяноўка пацвярджаецца зместам дысертацыі і аўтарэферата. Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца навуковым даследаваннем, якое грунтуецца на рэпрэзентатыўным моўным матэрыяле і праведзена на сучасным узроўні з выкарыстаннем метадаў і тэхналогій эксперыментальнай фанетыкі і праграмнага забеспячэння. Бібліяграфічны спіс складае 211 пазіцый. Вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 22 друкаваных працах агульным аб'ёмам 8,3 аўтарскага аркуша, у тым ліку ў 4 артыкулах у навуковых часопісах і зборніках, уключаных ВАК у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, і ў 3 артыкулах у замежных навуковых выданнях, якія

ўваходзяць у базу Scopus. Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання былі прадстаўлены на 18 навуковых канферэнцыях, у тым ліку ў Францыі, Аргенціне і Чэхіі. Высновы навукова абгрунтаваны, пацвярджаюцца атрыманымі вынікамі даследавання, адпавядаюць пастаўленым мэце і задачам, змяшчаюць у сабе новую навуковую інфармацыю.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў дысертацыі**

Атрыманыя Я. С. Зяноўка вынікі могуць знайсці прымяненне ва ўстановах навукі і адукацыі, дзе яны могуць выкарыстоўвацца з мэтай распрацоўкі тэарэтычных і прыкладных праблем сучаснай беларускай прасодыі, а таксама пры падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне беларускай філалогіі. Распрацаваны модуль дазваляе не толькі вывучаць інтанацыю беларускай мовы, але і праводзіць дадатковыя аналізы такіх прасадычных характарыстык маўлення, як меладычная структура выказвання, тэмп, тэмбр, інтэнсіўнасць і паўзацыя. Створаныя дысертанткай лінгваакустычныя рэсурсы знайшлі прымяненне ў сістэме сінтэзу беларускага маўлення, што пацвярджаецца актамі ўкаранення.

**Заўвагі па дысертацыі**

Уважлівае азнаямленне з тэкстам дысертацыі не дазволіла выявіць недахопаў, якія б тычыліся навізны, навуковай і практычнай значнасці атрыманых Я. С. Зяноўка вынікаў. Разам з тым лічым неабходным высветліць шэраг змястоўных момантаў і выказаць асобныя заўвагі.

1. На с. 82 аўтар слушна адзначае, што “для правільнай дэлімітацыі сказа” “неабходны аналіз яго семантыка-сінтаксічнай структуры”, але далей на сс. 82 і 83 аперыруе паняццем “структурныя схемы сказаў”, замяшчаючы гэтым паняццем і тыпалогію простых сказаў, прапанаваную Н. Ю. Шведавай, якая выкарыстана Я. С. Зяноўка на рысунку 3.1 (с. 82).

2. На сс. 85–88 аўтар апісвае розныя тыпы паўз (“раздзяляльныя”, “сінтаксічныя”, “папераджальныя”, “злучальныя”, “інтанацыйна-лагічныя”) і прыводзіць прыклады сказаў, у агучванні якіх яны выкарыстоўваюцца, а на с. 90 згадваецца яшчэ адзін тып паўз – “пунктуацыйныя”. Пры гэтым крытэрыі вылучэння тыпаў паўз і іх узаемасувязі застаюцца без тлумачэння.

3. На с. 79 аўтар піша, што “для рэалізацыі эмпірычнага падыходу стварэння асобных метадаў і алгарытмаў ажыццяўлення аўтаматызаванай прасадычнай дэлімітацыі тэксту” “абраны праграмны комплекс NooJ”, які “прадстаўляе шэраг функцый для анатавання, сістэматызацыі і пошуку лінгвістычных даных, выкарыстоўваючы розныя лінгвістычныя інструменты і метады. У дысертацыйным даследаванні праграма прыменена для аўтаматычнай маркіроўкі тэкстаў, марфалагічнага і сінтаксічнага аналізу”. Застаецца незразумелым, што абумовіла выбар менавіта гэтага праграмнага забеспячэння сярод іншага інструментарыю сучаснай камп’ютарнай лінгвістыкі.

4. У тэксце дысертацыі сустракаюцца нешматлікія некарэктнасці: памылкі друку (сс. 36, 67, 82, 92, 139); пропуск прыназоўніка (с. 77). Назіраецца схільнасць аўтара да празмернага ўжывання косак: так, толькі ў адным апошнім абзацы с. 77 можна адзначыць тры выпадкі неапраўданай іх

пастаноўкі: пасля слоў "сказанага", "аднак", "у той жа час". Акрамя гэтага, лічым, што словазлучэнне "перапынак гучання", ужытае на сс. 55, 58, 80, 86, некарэктнае з пункту гледжання спалучальнасці яго кампанентаў.

Выказаныя заўвагі не ўплываюць на агульную станоўчую ацэнку дысертацыйнага даследавання і не зніжаюць яго навуковай і практычнай значнасці.

**Заключэнне**

Дысертацыя Я. С. Зяноўка "Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі", падрыхтаваная пад навуковым кіраўніцтвам доктара філалагічных навук, дацэнта В. П. Русак, з'яўляецца самастойна выкананай кваліфікацыйнай навуковай працай, адпавядае спецыяльнасцям 10.02.01 – беларуская мова і 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка і патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь, якія прад'яўляюцца да кандыдацкіх дысертацый. Дысертацыя змяшчае новыя навуковыя вынікі па пытаннях культуры беларускага маўлення, рэлевантныя для функцыянавання сістэм спараджэння тэксту і маўлення – актуальнага напрамку прыкладной лінгвістыкі. У адпаведнасці з п. 19 "Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь" Зяноўка Яўгенія Сяргееўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова і 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка за:

1) вызначэнне тыпаў меладычных партрэтаў сказаў, якія характарызуюць інтанацыйныя канструкцыі беларускай мовы і ўключаюць рытміка-інтанацыйныя параметры, што адлюстроўваюць сістэму павышэнняў і паніжэнняў частаты асноўнага тону, тэмп і інтэнсіўнасць маўлення, тыпы міжфразавых і міжсінтагменных паўз;

2) вызначэнне ў залежнасці ад структуры і тыпу сказа сямі інтанацыйных канструкцый (ІК), якія характарызуюцца кірункам тону на ядзерным цэнтры і суадносінамі ўзроўняў тонаў частак ІК, а таксама працягласцю ядзернага цэнтра, узмацнення слоўнага націску на ім і наяўнасцю / адсутнасцю змычкі галасавых звязак у канцы вымаўлення галоснага ў цэнтры ІК, якая ўспрымаецца як рэзкі перарыў у гучанні;

3) распрацоўку сінтаксічнай граматыкі для аўтаматычнай экстракцыі тыпаў сінтагм, што, разам з улікам тыповых інтанацыйных мадэлей, спрыяе атрыманню выразнага штучнага маўлення, набліжанага да ўзорнага літаратурнага;

4) стварэнне аўтарскай лінгваакустычнай базы даных, якая ўключае рэпрэзентатыўны набор эталонных фраз, якія адлюстроўваюць інтанацыйныя асаблівасці мовы з пункту погляду сінтаксічнай структуры сказа, эмацыянальнай афарбоўкі, колькаснага складу сінтагм у сказе, а таксама колькасныя і якасныя вынікі аналізу інтанацыйных параметраў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Я. С. Зяноўка выступіла на семінары з дакладам. На семінары адбылася дыскусія, саіскальнік адказала на ўсе пытанні.

Водзыў на дысертацыю Я. С. Зяноўка "Лінгваакустычныя рэсурсы для беларускамоўных сістэм сінтэзу маўлення: фарміраванне, прагматычны патэнцыял, спосабы аптымізацыі", якая прадстаўлена на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасцях 10.02.01 – беларуская мова і 10.02.21 – прыкладная і матэматычная лінгвістыка, згодна з загадамі прарэктара па навуковай рабоце ГрДУ імя Янкі Купалы ад 14.04.2025 № 216, ад 18.04.2025 № 234 разгледжаны і зацверджаны на навуковым семінары "Актуальныя праблемы рамана-германскага і славянскага мовазнаўства" філалагічнага факультэта 30.04.2025, пратакол пасяджэння № 3.

У працы семінара прынялі ўдзел 13 чалавек з 19, з іх 13 кандыдатаў філалагічных навук.

Вынікі адкрытага галасавання: "за" – 13, "супраць" – няма, "устрымаліся" – няма.

Старшыня пасяджэння навуковага семінара:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры англійскай філалогіі
ГрДУ імя Янкі Купалы — А. А. Шэйко

Сакратар пасяджэння навуковага семінара:
кандыдат філалагічных навук,
дацэнт кафедры замежных моў
ГрДУ імя Янкі Купалы — Н. А. Леўчанка

Эксперты апаніруючай арганізацыі:

кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
прафесар кафедры перакладу і міжкультурнай
камунікацыі ГрДУ імя Янкі Купалы — Л. В. Рычкова

кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры беларускай філалогіі
ГрДУ імя Янкі Купалы — В. Л. Варановіч

ПОДПИСЬ УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела управления персоналом
учреждения образования «Гродненский
государственный университет имени Янки Купалы»
С.В. Нестерович
30. 04. 2025 г.

Отдел управления персоналом